## ***Першы крок***

**| Алег Елісеенкаў:**

«Чытаў поўнымі зборамі твораў...»



**Духоўнае не вымяраецца матэрыяльным. Але заўсёды робіцца той першы крок, калі чалавек ад першасных запатрабаванняў — быць накормленым і апранутым — пераходзіці, на інзпы ўзровень. ГІошук сябе ў гэтым свеце, імкненне спасцігнуць таямніцы быцця вымагаюць знаёмства з досведам іншых людзей. І чалавек захоплена пгукае інфармацыю, прачытвае процьму артыкулаў і кніг, ідзе ў бібліятэку. Калі ў першы раз? На гэтае пытанне сёння адказвае кампазітар, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2011 года Алег Елісеенкаў.**

— Першы раз я пайшоў у бібліятэку, напэўна, гадоў у пяць-шэсць. Гэта было ў Маладзечне. Я ўжо ўмеў чытаць, і, больш таго, мяне запісалі! Помню, гэта была падзея: я стаў дарослым, вялікім! А ў Маладзечне памяшканне бібліятэкі — адно з галоўных у горадзе. Уражанне такое, быццам я прыйшоў у храм! Узнімаўся па вялікіх лесвіцах, само памяшканне з калонамі, прасторная зала — гэта была пасляваенная пабудова. Кнігі... Тое адчуванне, калі бярэш іх у рукі, не перадаць. Пах асаблівы запомніўся. Часцяком хадзіў у бібліятэку, мне прапаноўвалі вельмі цікавыя кнігі.

У нашыя дні насупраць , скарбніцы стаіць новы Палац культуры, але радуюся: і праз сорак гадоў бібліятэка свайго статусу не страціла.

Пасля я закончыў кансерваторыю і трапіў у армію. Каля Раўбічаў у памяшканні клуба размяшчаўся аркестр, у якім я служыў, і там жа была бібліятэка. Чытаў поўнымі зборамі твораў. Перачытаў усяго Дастаеўскага, Гогаля, Тургенева... Магу пералічыць вялікую колькасць пісьменнікаў. Прычым, чытаў не толькі творы, а і перапіску. Паставіў сабе такую мэту: ёсць магчымасць чытаць — трэба гэта рабіць. За паўтара года службы прачытаў вельмі шмат літаратуры. Не тое што выпадковых кніг, а мэтанакіравана чытаў. У тым ліку і паэзію. Уся тая школьная праграма, як пачатак знаёмства з мастацкім словам, адышла ў мінулае. Я зірнуў на літаратуру па-іншаму.

Цяпер у мяне з бібліятэкай нават зрокавы кантакт: вокны кватэры выходзяць на Нацыянальную бібліятэку. Але шмат якую інфармацыю знаходжу і праз камп'ютар. Хаця "прафесійная" бібліятэка для мяне застаецца актуальнай па-ранейшаму.

Трэба сказаць, што і раней, і цяпер мяне заўсёды здзіўлялі работнікі бібліятэкі. Гэта від інтэлігенцыі, як быццам іншыя людзі, больш адухоўленыя, заўсёды эмацыянальна напоўненыя, зацікаўленыя. Гэта людзі, якіх я аднесіў бы да эліты грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ